Д. В. Ціханчык *(г. Мінск)*

# КАРЫСНЫЯ ЗАБАВЫ – ДЗІЦЯЧЫЯ ГУЛЬНІ Ў ТВОРЧАСЦІ І. К. КАНДРАЦЬЕВА

Творчая спадчына І.К. Кандрацьева надзвычай багатая і разнастайная. Сярод мастацкіх, гістарычных, дыдактычных твораў ёсць на наш погляд, цікавая і змястоўная праца, якая не страціла сваёй актуальнасці і ў нашы дні. Маецца на ўвазе зборнік, у якім сабраны і сістэматызаваны гульні і забавы для дзяцей, – «Дома и на воздухе: детские игры и забавы». У яго ўключаны гульні гімнастычныя, развіваючыя, карагодныя і інш., якія патрабуюць кемлівасці, кругагляду, памяці, уважлівасці.

Пачынаецца кніга з вельмі простых заданняў, якія паступова змяняюцца больш складанымі. Кніга змяшчае больш за дзве сотні гульняў: гульні-фокусы, гульні-задачы, гульні-шарады і многія, многія іншыя.

У працэсе гульні дзіця актыўна ўзаемадзейнічае са сваімі аднагодкамі, параўноўвае свае магчымасці і здольнасці з аналагічнымі якасцямі іншых дзяцей, робіць першыя высновы. Акрамя таго, гульні яшчэ і дысцыплінуюць – усе ўдзельнікі падпарадкоўваюцца сфармуляваным правілам, якія прапаноўвае вядучы гульні, вучацца адказваць за свае дзеянні, планаваць іх, улічваць абмежаванні і забароны.

Гульні з’яўляюцца важным сродкам разумовага развіцця дзіцяці, яны па-свойму ёсць крыніца ведаў. Большасць гульняў таксама мае немалаважнае выхаваўчае значэнне.

Кніга «Дома и на воздухе: детские игры и забавы» (в 3 ч. М.: П.П. Щеглов, 1894. 267 с.: ил.) складаецца з трох частак.

У прадмове аўтар тлумачыць, што ў яе ўвайшлі: «…усялякія гульні, ад простых да самых складаных, ад гульняў для сямігадовых, да гульняў, якія могуць быць

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

займальныя ўжо для дарослых юнакоў і дзяўчат. Сюды ўвайшлі гульні з мячом, шарамі, карагодныя гульні, гульні з рухам, якія патрабуюць памяці і ўважлівасці, разумовыя гульні па метадзе Фрэбеля, гульні-фокусы, гульні-прыказкі, загадкі, шарады, задачы, каламбуры, як карысная забава, увайшлі ўказанні, як і што можна вырабіць з кары і гліны і г.д.».

Лічыцца, што толькі дзіцяці прыстала жыць гульнёй, бавіць час у радаснай бесклапотнасці. Але шчасце дзяцінства, асалода гульні – мімалётныя, як мімалётны гэты час нашага жыцця, калі мы яшчэ маем час.

У гульні няма ніякай мэты, яе мэта і сэнс – у ёй самой.

У кнізе «Дома и на воздухе: детские игры и забавы» І.К. Кандрацьеў сабраў гульні розных слаёў грамадства, розных культурна-гістарычных перыядаў і розных краін. Да шматлікіх гульняў даецца кароткае апісанне, адкуль пайшла тая ці іншая гульня, аўтар расшыфроўвае назву гульні, потым прыводзіць падрабязнае апісанне правілаў.

Напрыклад, пра гульню «Бильбоке» распавядаецца: сваімі каранямі яна ўзыходзіць да XVII–XVIII стст., пры Людовіку XV гэтая гульня была ў модзе; для яе не існавала абмежаванняў па ўзросце.

Шмат гульняў прыведзены з прадмовамі дыялагічнай формы, напрыклад «Пирожок», «Флюгера», «Берегись», «Мясник и овцы», «Пиво варить», «Просо сеять», а таксама актыўна-рухальнага характару. Наступным чынам апісваецца гульня ў каршуна і куранят. Спачатку выбіраюцца каршун і квактуха, астатнія ўдзельнікі бяруць на сябе ролю куранят і становяцца ў шэраг за квактухай, трымаюць адзін аднаго за пояс. Каршун хоча напасці на куранят, але квактуха, расправіўшы крылы, іх абараняе, заўсёды становіцца перад каршуном.

Адбываецца такі дыялог паміж удзельнікамі гульні:

«– Коршун, коршун! Что делаешь?

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– Видишь, ямку рою.
– На что роешь ямку?
– Что бы денежку найти.
– На что тебе денежка?
– Иголку купить.
– На что тебе иголка?
– Мешок сшить.
– На что тебе мешок?
– Твоих детей туда посажать.
– Как? За что?
– Они мою городьбу изломали.
– А высока ли твоя городьба?
– Вот. Смотри».

Пасля дыялогу каршун накідваецца на курыцу з куранятамі...

У кнізе змешчана шмат традыцыйна-карагодных гульняў, напрыклад «Овес», «Селезень», «Топчите траву», «Просо сеять», «Заинька» і г.д. Аўтар апісвае і тлумачыць разнастайныя гульні для дарослых удзельнікаў.

Гульня з'яўляецца феноменам чалавечага быцця, гэта неад'емная частка нашага жыцця. Наўрад ці знойдзецца чалавек, які скажа, што ніколі не гуляў. Гульня – гэта ў пэўным сэнсе па-свойму праявы чалавечай фантазіі, якая адкрывае жыццёвыя сілы чалавека, магчымасці дзейнічаць вольна, раскрыць як мага свае здольнасці.

Прайшло шмат часу з моманту напісання І.К. Кандрацьевым кнігі «Дома и на воздухе: детские игры и забавы», але яна і сёння застаецца актуальнай і запатрабаванай.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ